Рух беларускі добра пашырыўся. Расейскае „здрасцьві“ што было запанавало у Кленіку выцеснена ужо беларускім дзендобры. Селяне пачалі сьмялей гаварыць па беларуску нават с панамі. Дзеўчаты і хлопцы выходзяць на ігрышчы у такой адзежы у якой красаваліся іх бацькі і дужа сталі смакаваць беларускіе песьні.

Але побоч добраго не мала і благога у нас. Гэтак, ёсць у сяле тайные шынкі і пустапарожніе людзі. Адзін с тых людзей Ўладзя А—ч баіцца скінуць свайго доўгаго сурдута, думаючы, што гэтая опратка дадае яму розуму; па беларуску ня хочэ гаварыць навет са сваей старэнькай маткай. Праўду кажучы з яго прымеру ніхто ня возьме, бо ўсе добра ведаюць што ён такое. Я лічу ня лішнім расказаць болей пра гэтаго ягомасця, бо такіх людзей у цяперэшніе часы німала, што свайго адракліся, але чаго яны варты і як да гэтаго дайшлі—цікава. Ўладзя А—ч як толькі вярнуўся з гвардіі, пачаў шукаць службы, праўда і знайшоў: астаўся у Мінску гарадавым, але ня доўга утрымаўся, бо і туды бяруць не гарэлку піць. Посьле паехаў ён у Сібір, аж і там галушкі з неба не валяцца, скора вярнуўся. Цяпер маніцца ехаць у Амэрыку.

Прыехаўшы с Сібіру Ўладзя пачаў дамагацца, каб браты зрабілі яго гаспадаром, не гледзя на тое, што ён меншы. Браты згодзіліся, але скора раскаіліся, бо за новым гаспадаром гэту вясну не было чым сеяць яравога поля. Нідаўна здохла пара конікоў блізка што з голаду, а ён па гэтым мала і бядуе, а ўзяўшы грошы за скуры сваей худобы, бярэ гарэлку па цэлым гарцу ды хваліцца, што ніхто больш за яго ня выпье. Брыдка так рабіць ягомасцю А—ч! Табе можна жыць па людзку, бо зямлі маеш кусочак ладны (30 дзесяцін) ды зямлі добрай. І ня стыдна гаварыць па беларуску, бо ты не маленькі і павінен ведаць, што беларуская мова для кожнаго беларуса—сьвятасць. *Белявы.*

### Навальніца.

С суботы на нядзелю, у ноч 15 сьнежня і у нас разгулялася мяцеліца, што і па ўсім немаль сьвеці Страшэнны вецер, отклік таго цыклону, што праходзіў праз усю Расею зачапіў і нас. Старые людзі кажуць што і ня помнюць такой благой хвілі. Вецер рваў і крышыў усё, што пападалося яму па дарозе. У лясох парабіў цэлае знішчэньне. Векавечные дрэвы павырываў с карэньнямі, а каторых ня мог змагчы — паламаў. У некаторых мейсцох лес посцельлю ляжыць. А сколькі шкоды нарабіла у вёсках! Паабарачывала будынкі, параскрывала хаты, паламала ветракі. Так у аднаго селяніна у вёсцы Астраўках пабіла на шчэпкі новы будынак, нават каменьня паацкачывала У сяле Остраве абурыла манапольку (мабыць вецер ведаў, што гэта згуба нашых селян). На Вольніцкім бару у Ягомасьця Кочана абярнула сырабойню і навогул шмат шкоды людзям нарабіла гэта навальніца. У гэтым часе нават некаторые чулі як грымеў гром. У гэтых днях ізноў нарадзіўся цыклён (віхор) у Лапландіі, але можэ дасць Бог, што ён пойдзе другім бокам і нас не зачэпіць, хаця апошніе дні вецер і гудзе у нас, але не с такой сілай. *Рыза—бэй.*

## З Вітэбшчыны.

### Елка і літэратурны вечэр.

У адным з двароў нашаго (Лепэльскаго) павету, на другі дзень Новаго Году, тутэйшымі паненкамі і панічамі была устроена у нас ёлка для дзяцей, а посьле ёлкі быў устроен літэратурный вечэр На ёлку апроч дваровых дзяцей, сабралося шмат дяцей с суседняй вёскі А 5 гадзіне запалілі ёлку. Сколькі-ж тут было радасьці, сьмеху трудна апісаць! Дужа прыятна было глядзець на дзетак як бегалі кругом ёлкі, некаторые з іх першы раз у сваім жыцьці бачылі ёлку. Як ужо дзеці у волю набегаліся і нагледзіліся на розные агні і іскраўкі (фаервэркі), тады маленькі унук тутэйшай абывацэлькі раздаваў цукеркі і кніжкі дзецям.

Пасьля быў устроен літэратурны вечэр; хлопчыкі і дзяўчынкі гаварылі вершы. Дужа пекна сказала Гэлена „Раніца у нядзельку“ (Я. Коласа) і „Калядны вечэр“ (Л Лобіка). Усім крэпка падабалося як мовіла «З Новым Годам» (Сьвідэрскай) і др, васьмілетняя. Пяклуша; ня горш сказаў Сямён „У судзе“ (Я. Коласа). Добра гаварылі вершыкі Міля і Юзюк Усе госьці з вялікай цікавасьцю слухалі дзяцей і білі на брава ім у ладкі. Беларускіе вершы вучыліся дзеці з газэты «Наша Ніва». А 11 гадзіне разышліся дзеці дамоў з надзеяй увідзець ешчэ ёлку на той год. *Сініца.*

## З Могілёўшчыны.

### Мсціслаўскі павет Мог. губ.

Жаляцца людзі на валасные суды.

— Выбіраем на судзьдзю астатняго пастуха, што ён з роду рубля ня відзеў, ня меў і ня злічыць яго. Такога судзьдзю купіць лягчэй.

Казаў адзін пісар сумленны:— „Сорамна мне, дзядзька, за сталом сядзець, як судзюць у нас. Надаячы дык проста і трваласці не хапіла ў мяне: «Ці вы,—кажу,—паздурэлі, голавы у Соркі прапілі? Уцяку з-за стала, калі такі прыгавар пастановіцца»...

— А якіе прыгавары тут?

А во якіе. Памёр адзін дужа заможны стары чэлавек, пакінуў сярэдніх гадоў жэнатаго сямейнаго атдзеленнаго даўно сына і другую жонку з малымі дзеткамі. Пакуль тая дзяліцьба, пакуль тое што, стары гэты сын пабіў аж да крыві мачыху і са сьвету яе збасываць хваліўся, а мачыха, пакуль ешчэ на нагах стаяла кукіш яму паднесла і бытцым-то злаяла.

— Ну, судзяцца...

— Як жа. Мужчына, дык той ведаў, як людзі судзяцца: гукнуць судзьдзю аднаго ды дрогога да сябе пачастуюць у хаці, а тады, едучы на суд, у дарозі пагрэюцца, а прыехаўшы к Сорцы або к Мэндалю забягуць; а як баба, дык ведама што за розум: шатубату, не прырыхтаваўшыся ў воласць жалабу сваю выкладаць.

Сідзяць судзьдзі праведные, насы чырвоные у борады утуліўшы.

Ці—ха! Суд ідзець...

Вот і савешчаніе, рада судзейская прамудрая:

-- Што ж, пыні, прыдзецца бабу «прышчапіць», каб волі рукам не давала.

— А й я так думаю. Ці хвароба ж ёй, столькі грошы меўшы — валаводзіць судзёў на сухую глотку..

— На 18 сутак бабу пад арэшт!

— Ну а пасынка ж чым пакаваць?

— А што тут доўга думаць глядзі колькі шчэ судоў будзіць, да поўначы так зацягне.—прыгаварыць яго, каб заплаціў 50 кап штрафу за грубіянства з бацькінай жонкай.

Што ж? І то добра!

— Лаюць нашы разумцы Думу: „Ат! Думаюць — думаюць сабе у кішэню, а не дадумаюцца у воласці парадкі навясці...

Трудна, мусіць, законы думаць, галавою працаваць — гэта-ж і на галаве мазалі с часам панарастаюць, хварэй яна і воласць і суды валасные.

Казаў адзін „сьвецкі“, у чорным жупане с Масквы прыехаўшы: «Да што-ста, рэбята, не будзе ста у нас парадку, пакуль уш не будзе-ста яво..»

— Хай ты пропадзеш на Хі троўцы са сваёю радаю. Мне здаецца, што было б ладна, каб воласць была не адна мужыцкая, а так агульна і панская, і жыдоўская, і папоўская, каб, значыцца, на ўсіх, каб усе ў ёй былі, адзін ды за другім глядзеў..

— Зьмешаў кашу з гарохам! Дык і суды такіе? Жыд будзе судзіць папа, поп мужыка, а мужык пана? Ну й згадаў...

— Ды я ня тое, ды калі, праўда, свой жа брат селянін, і за судзьдзю, самі выбіраем ды калі-ж гэта гарэлка ды крывата наша...

### Халоднае палеваньне.

Быхоў (Могіл губ.). У горадзе можна відзець паляўнічых, ці як іх ешчэ тут з расейска называюць «ахвотнікоў», каторые прадаюць скуры лісіц. Затым што у такога «ахвотніка» німа ні добрай стрэльбы, ні сабакі здольнаго да палёвы, ды і німа яму і часу, то ён вядзе «халоднае» палеваньне,— ён гэтых лісоў атручае

Не кажучы аб праступнасьці такога „палеваньня“ дабаўлю што хутка у нас звядуцца лісы, як зваліся козы, ласі, кабаны, бабры і інш., на каторых раптам наваліўся зьвер-чэлавек. *Саука Каваль.*

# З усіх старон.

### Забастоўка.

У Пецярбурзе 9-го студня с прычыны гадоўшчыны разстрэлу работнікоў, каторых у сваім часе вёў Гапон, абьявілі палітычную забастоўку 110,604 работнікоў. Яны у 50 мейсцох пробавалі устроіць дэмонстрацію але за ўсякім разам паліція шчыра разганяла. За пеяньне рэволюцыйных песень і упорства проці паліціі арэштавано 134 работнікоў. Пры арэштаваньні дэманстрантоў былі тры спробы адбіць ад паліціі затрыманых. На Глазавой вуліцы паліцэйскі два раза стрэліў да таўпы, але нікога не раніў. Парадак быў установлены у цэнтры гораду а гадзіне 3-й, а на прадмесцях а г. 8 вечэрам.

### Арэшт тайнай друкарні.

Ахранная паліція арэштавала у Пецярбурзе у доме на Песках трох чэлавек, калі тые друкавалі праклямацыі соціаль-рэволюціонероў. У арэштаваных знайшлі аружжэ. Праклямацыі прызывалі да забастоўкі 9 студня У звязку з гэтым здарэньнем павальные вобыскі ва ўсіх часьцінах горада.

### Проці запечных адвакатоў.

Міністэрства юстытуціі апрацавало праект змаганьня з запечным адвакацтвам Маняцца завясьці строгіе кары на тых, што займаюцца адвакацтвам ні маючы на гэта права.

### Прызнаньне малдавянскай мовы.

Сынод пацвярдзіў правілы каб завясьці ў Бэсарабіі у прыхадзкіх школах малдавянскую мову як дадатковую пры навучаньні дзяцей малдавян.

### Духоўные дэпутаты.

Ходзюць чуткі, што вялікая часць духоўных дэпутатоў у г. Думе хочуць зрачыся свайго дэпутацтва с прычыны тэй, што іхней работай у Думе дужэ нездаволены выборшчыкі.

### Новые кніжкі да навучання.

Міністэрство асьветы бярэць у свае рукі выдаваньня кніжэк да навучаньня у школе. Каб лепш работа ішла міністэрство уступаець у хаўрус з вядомай выдавецкай фірмай у Маскве—т-во И. Д. Сытіна.

### Змаганьне с пьянствам.

У Сызрані паветовае земскае сабраньне пастанавіло закрыць казённые манапольки і піўные у трох валасьцях.

### Свабода друку.

Як падлічыла газэта «Русское Слово», то ў цягу 1913 году у расейскім гасударстве было наложэна на рэдактараў 374 штрафы агульнай сумай на 139,655 рублёў. Конфіскацій было 223, арэштована 63 рэдактароў, закрыта 20 часопісей.

### Проці роднай мовы.

Інспэктар народных школ кіеўскаго округа забараніў дзецям украінцам пеяць па украінску калядные песьні

## У мутным віры.

Груган сустрэўшы салаўя
С сваяцтвам лезці стаў к таму:
—Ты родны мне, як бачу я, —
Хадзі ж! як брата абыму.

У нас с табой адзін фасон —
Як глюгі, крыльля і насы,
Птушына ў нас быцьцё і сон,
Птушыны маем галасы.

Дык што ж нам жыць так па-сабе?!.
Пры том табою не гарджу,
Хоць я шмат большы ад цябе
І ў чорнай вопратцы хаджу.

— О, вельмі дзякую за чэсць!—
Атпеў салоўка з-над палян,—
Мо ў нас і аднакова шэрсць,
А ўсё-ж такі ты брат,-груган!..

**К—а.**

## Шарада № 2.

Эх, памыйся, мой дружок,
Мылам ды вадою,
А так складна, як у нас
*Першае-другое*

А калі ты ўжо *другі*
І *чацьвёрты* ўдаўся,
Вось чаго замест бліна
Ты дапамінайся.

Гамані: давайце мне
*Чацьвёртае* з раду
І *другога* побач з ім,
Бо ня будзе складу.

Ну, а *усе*—кругом цябе
І ты з імі разам,
Ажно цешыцца душа
Адным гэтым сказам.

**К—а.**

Разгадка Шарады з № 51—52 **Каляды.**

Акуратную разгадку вершам прыслаў толькі п. А. Каласун-Тышынскі с Пецярбурга, каторому і выслана награда «Шляхам Жыцьця».

Тое першае—гэта ты, песьняр,
А другое—пекны Божы дар:
Ў лесі як расло,
Дрэвам звалося,
Згэбляванае ж
Дыляй сталося.
А людцы ўсё разам Каляды завуць,
Цэлы год кругом, як бы шчасьця ждуць.
Калі ж яно прыдзе,
Песьню засьпеваюць,
Часам—то бывае!
Чаркі ў ход пушчаюць.

**А. Каласун Тышынскі.**

## ЖАРТЫ.

**Дагадаўся.**

Ехаў адзін гаспадар і кабыла яго саўсім замарылася і прыстала. Гаспадар стаў яе паганяць і біць, а яна усё ня йдзе.

Тады ён пачаў ей мовіць:

— Воўк-жэ цябе зьеш, калі ты ня хочаш ехаць, то цехатой пойдзеш.

Выпрог кабылу, прывязаў з заду і ўзяўшы за аглоблі пацягнуў калёсы сам.

*Х. Бульба.*

Рэдактар выдавец
А. Ўласоў


# НАСТАЛА ПАРА,

каб Біомальц у нашым дамовым жыцьці заняў такое ж мейсцо, як у нямеччыне, гэтай клясычнай старонцы дізты. Біомальц — гэта пажыўная і укрэпляючая рэч, выцягнутая з адборнага соладу. Дзецям слаба развітым, кволым, бледным у каторых німа апэтыту, трэба даваць Біомальц чыстый або у малацэ, каві, гарбаці, юшніку і т. д. Біомальц араматычны і смачны і куды пажыўнейшы за какао Узрослым, каторые хворы на малакроўе, на живот, на лёгкіе, або нэрўным Біомальц незамяніммы; яго дзейства пэўнае і скорае. Ва ўсіх аптэках і аптэкарскіх магазынах па 1 руб. 50 кап. і 85 к. літэратуру высылае Таварыство „Автосилъ“ Бэрлін і Вільня.

# ПРЫСЯЖНЫЕ ЭКСПЕРТЫ

## аб школах крою, шыцьця і прыгожаго рукадзельля

# Праф. К. Леванскаго

На просьбу прафэсара К. Леванскаго, мы ніжэпадпісаные былі камандараваны Харкоўскай Рэмесленнай Управай дзеля экзаменаваньня вучэніц **ВІЛЕНСКАЙ, МІНСКАЙ, СМАЛЕНСКАЙ, МОГІЛЕЎСКАЙ і ВІТЭБСКАЙ** школ крою шыцьця і прыгожаго рукадзельля і майстэрэнь прафэсара К Леванскаго, у каторых мы экзаменавалі ад 13 да 18 сьнежня прошлаго 1913 году. Рабіўшы экзамены у яго школах, мы можэм сказаць, што падобнаго прыкладнаго парадку і гэткаго знаньня і вядзеньня справы, як у ягомасьця Леванскаго—мы нідзе дагэтуль не сустрэчалі. Новы способ навучаньня крою; шыцьця і прыгожаго рукадзельля, каторы выроблен ягомасцям Леванскім, скарачывае час навучаньня блізка на 3/4 проці вымогоў другіх школ. Работы выпоўненые вучэніцамі школ Леванскаго, далёка прасцігнулі усе дагэтаго спатыканые намі у другіх вучэлялёў і школу ягомасця Леванскаго — безварункова з другімі зраўніваць нельга. З вялікай пэўнасьцю можэм сказаць, што работы, якіе мы бачылі у школах, так штукарна выпоўнены, што пахвалу трудна выразіць славамі, і вучэніцы каторые кончылі яго курсы саўсім заслужываюць названьня слаўных мастачак у сваім дзеле.

Старшына Харкоўскай Рэмесленнай Управы **Власенко**. Прысяжны экспэрт А. **Лапіна**.

У школах крою і шыцьця праф К. Леванскаго на вольные мейсцы прыймаюцца запісі вучэніц штодзень у **Вільні** — вялікая 27; **Мінск** — Захароўскі пер, 9; **Маскве** — Камергерскій пер 1/22 тэл № 4—37—17; **Ростове н/Д.** — Маскоўская 62; **Вітэбску** Гоголеўская д Гершевіча; **Арле; Гомелі; Житоміры; Могілёві; Бабруйску; Каця рынаслаўлі** і ў многа якіх другіх гарадох Расеі.

Ядыная школа у каторай экзамены адбываюцца перад прысяжнымі экспэртамі рэмесьленных управ, спэцыальна запрошэных і вучэніцы атрымліваюць цэхавые патэнты на масцерыц і падмасцерыц с правамі а такжэ школьные сьвідзецельствы.

**Пры школах майстэрні.—Пробные праграмы высылаюцца безплатне.**

Толькі **БЕЛАРУСАМ** селянам прадаюцца вучасткі зямлі у іменьні Гай, каля самаго гораду Пінска. Задаток па 20 руб. ад дзесяціны, расрочка платы на колькі гадоў па 6%. Асабліва важна для гароднікоў, рэмесьнікоў, фабрычных работнікоў і скатаводоў.

**Э. Зуземіль, ім Гай, каля гор. Пінска (Мінск. губ.).**




**Галёшы** элеганцкіе Фасоны — поўная парука
**Лінолеум** грамадны выбор
**РЭКОМЭНДУЕ:**

# Т-во „ПРАВАДНІК“

**ВІЛЕНСКІ АДДЗЕЛ**
Вялікая вуліца д. гр. Тышкевіча № 96.
Тэлефон № 10—13.

# Беларуская Кнігарня

## Вільня, Завальная 7.

Атрымала на склад і прадае вось якіе нованадрукованные кніжкі:

| | | Цэна. |
|---|---|---|
| 1) | **„Маладая Беларусь“** 1-я сэрыя 3 ці сшытак . | 1 р. — к. |
| 2) | **„Сон на Кургане“**, драматычная паэма—Я Купалы . . . . . . . . . . . . . . . | — 50 к. |
| 3) | **„Batrak“** і **„Jak Jurka zabahacieŭ“**—вершаваные аповесьці Я. Коласа . . . . . . . . | — 10 к. |
| 4) | **«Abrazki»**—Зм трока Бядулі . . . . . . . . | — 15 к. |
| 5) | **«Pieśni»**—Цішкі Гартнага . . . . . . . . . | — 15 к. |
| 6) | **„Амэрыканец“**—апаведанне А Новіча . . . | — 10 к. |
| 7) | **„Dudka Biełaruskaja“**—Мацея Б рачка. Новые выданьне . . . . . . . . . . . . . | — 15 к. |
| 8) | **«Як яны жаніліся»** — жарт у І-м акці А. Вологодзькаго, пераклад Власта (Литограф) | — 30 к. |
| 9) | **„Мядзьведзь“**—жарт у І-м акці А. Чэхова. Пераклад з расейск . . . . . . . . . | — 30 к. |

Апрача гэтых **«Беларуская Кнігарня»** мае на складзе і прадае усе іншые дагэтуль друкаваные беларускіе кніжкі. Для мястэчковых кнігатаргоўцаў кнігарня дае **вялікую уступку**.

# У маёнтку Вялікіе Граничы

## Віленскаго пав. Віленскай губ.

Дзедзіча Свіды, прадаюцца 400 дзесяцін зямлі, парэзаные на хутарскіе вучасткі рознай меры, у кожным ёсць сенажаць і лясочак. 7 вёрст ад ст Уша Л. Р. ж. д. Аб варунках можна даведацца па адрасу: *Город Радашковічы, Віленскай губ., м. Вялікіе Граничы, Стэфану Сяда.*

**дастунна кожнаму** купіць вучастак зямлі у „Звярынцы“ у самай лепшай часьці гораду Вільні. Мейсцо васць прыгожая, здаровая ле'оррэка.

Цэны і варункі выгодные

С купляй пасьпешайця: зямлі асталося саўсім мала! Гэта—апошні раз напамінаецца.

За справамі звертацца у кантору па прадажы вучасткоў у Зьвярынцы: Вільня „Звярынец“, Георгіеўскіпраспэкт, д. № 48. Тэл. № 46.

Спраўкі выдаюцца праз увесь дзень, не вылучаючы 1 сьвят.


Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.